УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# АКСАКАЎ СЯРГЕЙ СЯРГЕЕВІЧ

## КАМПАЗІТАР

## 6 СТУДЗЕНЯ 1891 Г. – 4 ВЕРАСНЯ 1968 Г.

**ФОНД № 95**

**ВОПІС № 2**

**[1850-я] – 1961, 2009 гг.**

**МІНСК 2021**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 2 ф. 95**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ С.С. АКСАКАВА | 1-16 | 1-3 |
| 1.1. | П'ЕСА І ВАКАЛЬНЫЯ ТВОРЫ | 1-3 | 1 |
| 1.2. | ПІСЬМО ДА С.С. АКСАКАВА, КОПІІ АСАБІСТЫХ ДАКУМЕНТАЎ І ІНШ. | 4-8 | 1-2 |
| 1.3. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 9-16 | 2-3 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ СВАЯКОЎ С.С. АКСАКАВА | 17-22 | 3 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ А.Ц. ГРАЧАНІНАВА | 23-27 | 3-4 |

## Прадмова

**Аксакаў Сяргей Сяргеевіч** нарадзіўся 24 снежня 1890 г. (6 студзеня 1891 г.) у сям'і калежскага сакратара С.Р. Аксакава і С.І. Аксакавай (дачкі контр-адмірала І.І. Свешнікава) у [маёнтку Страхава Бузулукскага ўезда Самарскай губерні (цяпер – вёска Страхава Борскага раёна Самарскай губерні)]; з'яўляўся адзіным праўнукам рускага пісьменніка С.Ц. Аксакава. У [1900 г.] быў прыняты ў Паліванаўскую мужчынскую гімназію ў г. Маскве. Адначасна паступіў у Маскоўскую кансерваторыю (цяпер – Маскоўская дзяржаўная кансерваторыя імя П.І. Чайкоўскага), пакінуў яе праз некалькі месяцаў і працягваў навучанне ў прыватных студыях: займаўся па класу фартэпіяна ў К.М. Ігумнава, вывучаў кампазіцыю ў А.Ц. Грачанінава, музыказнаўства – у прафесара Ю.Д. Энгеля. З 1911 г. да 1914 г. атрымліваў вышэй-шую юрыдычную адукацыю ў Імператарскім Аляксандраўскім ліцэе (г. Санкт-Пецярбург) і працягваў музычную адукацыю ў галіне аркестроўкі і кампазіцыі ў прафесара С.М. Ляпунова. З 1914 г. працаваў губернскім сакратаром у аддзяленні Зводу законаў канцылярыі Дзяржаўнай рады Расійскай імперыі. У 1915 г. перапыніў дзяржаўную службу і паступіў у Пажскі Яго Імператарскай Вялікасці корпус, дзе па сканчэнні паскоранага курса атрымаў афіцэрскае званне. У 1916 г. у якасці начальніка атрада Таварыства Чырвонага Крыжа быў скіраваны ў г. Полацк, затым – у г. Рыгу і г. Пскоў. У 1918 г. атрад быў расфар-міраваны, С.С. Аксакаў з сям'ёй пераехаў у г. Самару, потым (з войскам адмірала А.В. Калчака) – у г. Харбін (Кітай). У Кітае працаваў загадчыкам кліматычнай станцыі на Кітайска-Усходней чыгунцы, агентам Эканамічнага бюро, пасля – выкладчыкам у Харбінскай вышэйшай музычнай школе імя А.К. Глазунова (цяпер – Кансерваторыя імя А.К. Глазунова), з верасня 1929 г. да снежня 1945 г. – прафесарам фартэпіяннага класа і выкладчыкам гісторыі музыкі і тэарэтычных музычных дысцыплін Шанхайскай дзяржаўнай кансерваторыі (цяпер – Шанхайская кансерваторыя музыкі). З 1935 г. узначальваў аб'яднанне эмігрантаў-мастакоў, музыкантаў і паэтаў "Шатёр", у 1930 г. стаў членам Рускага юрыдычнага таварыства ў г. Шанхае. У 1946 г. атрымаў савецкае грамадзянства. З таго часу чытаў лекцыі па гісторыі музыкі і браў удзел у канцэртах у дні савецкіх дзяржаўных святаў у Таварыстве грамадзян СССР у г. Шанхае. У 1954 г. атрымаў дазвол на вяртанне ў СССР і быў накіраваны ў рабочы пасёлак "Новоивановский" Омскай вобласці, праз тры тыдні знайшоў працу кіраўніка тэарэтычных і фартэпіянных класаў у музычнай школе г. Тара Омскай вобласці і пераехаў туды. У 1955 г. па рашэнні Міністэрства культуры СССР быў пераведзены ў г. Мінск, дзе [да выхада на пенсію] выкладаў у Рэспубліканскай музычнай школе-дзесяцігодцы пры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А.В. Луначарскага

(цяпер – Рэспубліканская гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі)[1].

У 1914 г. з’явіліся першыя музычныя творы С.С. Аксакава, адначасова ў г. Кіеве, г. Маскве і г. Мінску адбыліся яго першыя канцэртныя выступленні. Да 1930 г. С.С. Аксакаў напісаў: вакальныя цыклы на словы А.А. Ахматавай і А.М. Рамізава, звыш 30 рамансаў, фартэпіянных п’ес і санат, некалькі хароў, сімфанічную паэму “Из Данте”, пачаў працу над операй “Психея”. У 1950-х гг. ім былі створаны: вальсы, канцэртныя ўверцюра і эцюд, сімфанічная паэма “В Туровской пуще” (на сл. У.М. Дубоўкі), фартэпіяннае трыо, рамансы і песні на словы В.Я. Брусава, С. Зубава, А.М. Пляшчэева і інш.

У 1955 г. С.С. Аксакаў быў абраны членам Музычнага фонду СССР пры Саюзе кампазітараў СССР, у 1957 г. – членам Саюза кампазітараў СССР.

С.С. Аксакаў памёр 4 верасня 1968 г. Пахаваны на Усходніх могілках г. Мінска.

Дакументы С.С. Аксакава паступілі ў БДАМЛМ ад музыказнаўцы Ізідора Герасімавіча Нісневіча ў 1972 г. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 2, у які ўвайшлі 27 спраў (45 дак.) за [1850-я]–1961, 2009 гг.

Вопіс складаецца з 3 раздзелаў, складзеных па намінальна-храналагічным прынцыпе:

Першы раздзел – “Дакументы С.С. Аксакава” – прадстаўлены п’есай, рамансамі і песнямі, пісьмом да С.С. Аксакава, копіямі асабістых дакументаў, праграмай канцэрта з яго ўдзелам, выдрукам фрагмента кнігі аб С.С. Аксакаве (2009), фатаграфіямі С.С. Аксакава з членамі сям’і і знаёмымі, фатаграфіямі іншых асобаў і інш. за [1870-я – 1880-я]–1961, 2009 гг.

Другі раздзел – “Дакументы членаў сям’і С.С. Аксакава” – складаецца з альбома з паэтычнымі творамі В.М. Аргамакава (сваяка), пісьма да М.С. Аксакавай (сястры) і прадметнай кніжкі слухачкі Маскоўскіх вышэйшых жаночых курсаў на яе імя, фатаграфій членаў сям’і С.С. Аксакава і інш. за [1850-я]–[1959] гг.

Трэці раздзел – “Дакументы А.Ц. Грачанінава” – прадстаўлены сімфоніяй H-Moll і рамансамі, яго фатаграфіямі, індывідуальнай, і з жонкай за [1911]–[1938] гг.

Прадмову склала
Вядучы архівіст В.Ф. Шаталава
16.03.2020

[1] Біяграфічныя звесткі ўзяты з выдання: А.С. Куляшоў. “Аксаковы. История разбитых судеб”. – Масква: “Территория”, 2009. (онлайн:) http://aksakoff.ru/2010/01/chapter3.

Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 18.03.2021
№ 3

ФОНД № 95
ВОПІС № 2
[1850-я] -1961, 2009

| №№ п/п | Загалоўкі справ | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ С.С. АКСАКАВА** | | | | |
| | **1.1. П'ЕСА І ВАКАЛЬНЫЯ ТВОРЫ** | | | | |
| 1 | "Dance" ("Танец"). П'еса для фартэпіяна. Ор. 28. Выразка з друкаванага выдання з праўкай С.С. Аксакава | [1928-1945] | 4 | 1 | |
| 2 | "Когда умру я...", "Обо мне съ тобою много толковали". Рамансы для голасу з фартэпіяна. Словы А.М. Пляшчэева (з Г. Гейнэ). Рукапіс Г.Н. Папофа (G.N. Papoff) з праўкай С.С. Аксакава | 1929, [1920-я гг.] | 4 | 2 | |
| 3 | "Бяссмертнікі", "У памятника" і інш. Песні для голасу з раялем і голасу з фартэпіяна. Словы П.Ф. Прыходзькі. Рукапіс перапісчыка з праўкай С.С. Аксакава | 1960-1961 | 9 | 3 | |
| | **1.2. ПІСЬМО ДА С.С. АКСАКАВА, КОПІІ АСАБІСТЫХ ДАКУМЕНТАЎ І ІНШ.** | | | | |
| 4 | Пісьмо піяніста і кампазітара В.М. Аргамакава С.С. Аксакаву з біяграфічнымі звесткамі пра сябе і ўказаннем на факт іх сваяцтва (Масква) | 1957 | 1 | 1 | |
| | *   *   * | | | | |
| 5 | Копіі асабістых дакументаў С.С. Аксакава (метрычнага пасведчання аб хрышчэнні (1900), пасведчання аб сканчэнні праграмы Маскоўскай кансерваторыі за 1904-1911 гг. (за подпісам А.Ц. Грачанінава), пасведчання аб працы ў Шанхайскай дзяржаўнай кансерваторыі ў 1929-1945 гг. і паведамлення Дзяржаўнага консульства СССР у Шанхаі аб дазволе на выезд у СССР (1954). Выдрук | | 4 | 4 | |
| | *   *   * | | | | |
| 6 | Праграма канцэрта, прысвечанага 70-годдзю з дня нараджэння А.Ц. Грачанінава, з удзелам С.С. Аксакава (кампазітар, выканаўца за раялем і дакладчык) (Шанхай, Кітай) | 1935 | 2 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | * * * | | | | |
| 7 | А.С. Куляшоў. "Сергей Сергеевич Аксаков - русский-советский композитор". Глава кнігі "Аксаковы. История разбитых судеб" (Масква, 2009) (у т.л. успаміны І.С. Аксакавай (дачкі С.С. Аксакава) пра бацьку і вытрымка з яго выступлення на радыё пра музычна-тэатральнае жыццё ў Маскве ў 1900-1915 гг.).<br>Выдрук | | 10 | 1/3 | |
| | * * * | | | | |
| 8 | Выпіскі С.С. Аксакава пра вядомых дзеячаў беларускай культуры і навукі XIX - пач. XX стст. | [пасля 1955 г.] | 1 | 1 | |
| | **1.3. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 9 | Фатаграфіі С.С. Аксакава ў групах з С.І. Аксакавай (маці), К.С. Аксакавай (другой жонкай), В.С. і І.С. Аксакавымі (дочкамі) і інш. | [кан. 1890-х гг.], 1959 | 2 | 2 | |
| 10 | Фатаграфія С.С. Аксакава ў групе з доктарам А.А. Алёхіным, піяністам [Б.С.] Захаравым і інш. (Петраград).<br>Выразка з газеты | 1916 | 1 | 1 | |
| 11 | Фатаграфія С.С. Аксакава ў групе з выкладчыкамі і студэнтамі Шанхайскай дзяржаўнай кансерваторыі (Кітай).<br>Фатограф [С.Х.] Вонг | 1935 | 1 | 1 | |
| 12 | Фатаграфія С.С. Аксакава ў групе з літаратуразнаўцам С.І. Машынскім, дырэктарам музея-запаведніка "Абрамцево" М.П. Пахомавым і інш. у час ускладання вянкоў на магілу пісьменніка С.Ц. Аксакава ў 100-гадавіну з дня яго смерці (Новадзявочыя могілкі, Масква) | 1959 | 1 | 1 | |
| 13 | Фатаграфія С.С. Аксакава ў групе з М.І. Аладавым, Л.С. Мухарынскай, Я.К. Цікоцкім, Р.К. Пукстам і Г.І. Цітовічам у Саюзе кампазітараў БССР | 1960 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 14 | Фатаграфія з паметай С.С. Аксакава "М.Н Аненков, поэт", зробленая ў фотасалоне К. Бергамаскі (Санкт-Пецярбург) | [1880-я гг.] | 1 | 1 | |
| 15 | Фатаграфія С. Капніста (праўнука паэта і драматурга В.В. Капніста), зробленая ў | 1905, [пач. XX ст.] | 3 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | фотасалоне Р.Ф. Брадоўскага (Масква), і фатаграфія неўстаноўленай жанчыны | | | | |
| 16 | Фатаграфіі цэнтра Масквы ў час паводкі | красавік 1908 г. | 2 | 2 | |
| | **2. ДАКУМЕНТАЎ СВАЯКОЎ С.С. АКСАКАВА** | | | | |
| 17 | В.М. Аргамакаў. Балада, басні, вершы, эпіграмы і інш. за 1893-1959 гг. Альбом для вершаў. Аўтограф | [1959] | 35 | 1/93 | |
| | * * * | | | | |
| 18 | Пісьмо знаёмай да М.С. Аксакавай (сястры) на мастацкай паштоўцы з выявай Фізіка-хімічнага інстытута Маскоўскіх вышэйшых жаночых курсаў (Масква) | 1910 | 2 | 1 | |
| 19 | Прадметная кніжка слухачкі Гісторыка-філасоўскага факультэта Маскоўскіх вышэйшых жаночых курсаў на імя М.С. Аксакавай | 1908 | 5 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 20 | Фатаграфіі С.Р. Аксакава (бацькі), С.І. Аксакавай (маці), К.С. і М.С. Аксакавых (брата і сястры) і інш. | [кан. 1890-х гг.] - [1920-я гг.] | 5 | 5 | |
| 21 | Фатаграфіі В.Р. Аксакавай (роднай цёткі і хроснай) і С.А. Аксакавай (стрыечнай бабкі), зробленыя ў фотасалонах А. Васільева і Ф.Ф. Тадоўскага (Самара, Расія) | [1850-я гг.], [да 1883 г.] | 2 | 2 | |
| 22 | Фатаграфіі пейзажаў сядзіб Аксакавых у вёсцы Аксакава Самарскай губерні і ў вёсцы Кураедава Уфімскай губерні (Расія) | 1904-1908 | 4 | 4 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ А.Ц. ГРАЧАНІНАВА** | | | | |
| 23 | А.Ц. Грачанінаў. Сімфонія H-Moll. Op. 6. Партытура. Перакладанне для фартэпіяна ў 4 рукі. Друкаванае выданне з дароўным надпісам А.Ц. Грачанінава С.С. Аксакаву ад 17.07.1932 г. (Парыж) | 1932 | 34 | 1 | |
| 24 | А.Ц. Грачанінаў. "Я люблю тебя". Раманс для голасу з фартэпіяна з вакальнага цыкла "Цвъты зла" / "Les Fleurs du Mal". Op. 48. Словы Ш. Бадлера на рускай і французскай мовах. Выразка з друкаванага выдання | [1911] | 4 | 1 | |
| 25 | А.Ц. Грачанінаў. "Осеннiе мотивы" ("Сентябрь" і "Октябрь") / "Esquisses d'Automne" ("Septembre" і | [да 1938 г.] | 5 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | "Octobre"). Рамансы. Op. 43, №№ 1-2. Словы Г. Галінай і N.N. на рускай мове і М.Д. Кальвакарэсі (M.D. Calvocoressi) на французскай мове. Выразкі з друкаванага выдання | | | | |
| | * * * | | | | |
| 26 | Фатаграфія А.Ц. Грачанінава з М.Р. Грачанінавай (жонкай) (Парыж) | 1912 | 1 | 1 | |
| 27 | Фатаграфія А.Ц. Грачанінава, зробленая ў фотасалоне Э. Марковіча (Парыж), з дароўным надпісам А.Ц. Грачанінава С.С. Аксакаву | 1931 | 1 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 27 (дваццаць сем)

спраў з № 1 па № 27 , 45 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку фонда зрабіла

вяд. архівіст В.Ф. Шаталава

______________________

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.